**Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і**
М 54 **літаратуры ў школе і ВНУ**: зб. навук. арт. / пад рэд. І. У. Таяноўскай, Т. В. Мальцэвіч. – Мн.: БДУ, 2006. – Вып. 5. – 110 с.

***В. У. Праскаловіч, Т. В. Рубанік, В. У. Дылеўская***

# ФАРМІРАВАННЕ КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ ШКОЛЬНІКАЎ (НАЗІРАННІ НАД ТЭХНАЛОГІЯЙ НАВУЧАННЯ ЛІТАРАТУРЫ Ў ПАДРУЧНІКАХ)

Ва ўмовах крызісу, якім ахоплены розныя сферы грамадства, чалавек цалкам дэзарыентаваны. Адны каштоўнасці з ліку ўхвальных згубілі свой колішні статус, іншыя – з ліку дэклараваных раней як адмоўныя – паўстаюць пазітыўна афарбаванымі. Крызіс грамадства, закрануўшы сферу індывідуальнай і грамадскай свядомасці, абвострыў праблему каштоўнасцей. "Чым у большай небяспецы знаходзіцца жыццё, тым ярчэй ззяюць яго глыбінныя каштоўнасці" (Поль Ля Кур). Як бачым, пастаноўка праблематыкі агульначалавечых каштоўнасцей узнікае як адказ на вызаў часу. І можна думаць, што наш час будзе пазначаны ў гісторыі як перыяд вялікай пераацэнкі каштоўнасцей, напружаных роздумаў па мноству пытанняў, пастаўленых жыццём. Як ніколі раней, і навуковая думка, і намаганні практыкаў засяроджваюцца на тым, каб знайсці шляхі выхаду з крызіснай сітуацыі, прапанаваць свае ідэі абнаўлення, перабудовы адукацыі: у цэлым увогуле і па многіх канкрэтных накірунках гэтай вельмі складанай справы у прыватнасці. Адна за другой узнікаюць і публікуюцца педагагічныя канцэпцыі, рэкамендацыі, прапановы, скіраваныя на фарміраванне каштоўнасных арыентацый школьнікаў сродкамі літаратуры. У рэчышчы гэтага магістральнага напрамку айчыннымі вучонымі, настаўнікамі падрыхтаваны вучэбна-метадычны комплекс па беларускай літаратуры для старшых класаў, у аснову якога пакладзены фундаментальны прынцып педагагічнай навукі і практыкі – прынцып арыентацыі на агульначалавечыя і нацыянальныя культурныя каштоўнасці. Аб ім і пойдзе гаворка. Нашы назіранні, зразумела, не могуць прэтэндаваць на паўнату і вычарпальнасць. Аднак змест і пабудова нават асобных падручнікаў [1; 2] даюць магчымасць высвятліць зыходныя прынцыпы структуравання тэкставых, выяўленчых і метадычных матэрыялаў, зразумець логіку і мэтанакіраванасць навучання, яго тэхналогію. Яго аўтары-складальнікі (А. У. Рагуля, В. В. Кушнярэвіч) кіраваліся меркаваннем, што вывучэнне літаратуры ў старшых класах неабходна паставіць на новы тэарэтыка-метадалагічны ўзровень. На думку аўтараў, у 9-м і 10-м класах базавай школы ўзрастае роля індывідуальнага самастойнага перажывання мастацкай рэальнасці на першым этапе яе рэцэпцыі – успрымання і рэфлексіі. На ўроках шмат увагі аддаецца сумеснай працы, скіраванай на стварэнне кантэксту і раскрыццё значэнняў структуры. Пад кіраўніцтвам настаўніка вучні будуюць структурна-функцыянальны ланцужок і прасочваюць эвалюцыю культурных сэнсаў, а заадно – і эвалюцыю мастацкай свядомасці нацыі, дынаміку каштоўнасных адносін грамады і асобы да сацыяльнай рэчаіснасці, да самога існавання, у тым

ліку і свайго ўласнага.

Аналіз прац айчынных і замежных вучоных, педагагічны вопыт прывёў нас да вываду, што школа абавязана ўсімі сродкамі ўздзеяння імкнуцца да фарміравання каштоўнасных арыентацый сваіх выхаванцаў. Гэта думка пацвярджаецца і сучаснымі псіхалагічнымі даследаваннямі. Так, чэшскі псіхолаг Я. Гудзечак [3] адзначае, што арыентацыя на пэўныя каштоўнасці можа ўзнікнуць толькі ў выніку іх папярэдняга прызнання, станоўчай ацэнкі. Вучоны прыводзіць структуру прыняцця і асваення асобай каштоўнасцей (гл. схему – мал. 3).




**Мал. 3**
**Структура прыняцця і асваення індывідам каштоўнасцей**

Веданне гэтай структуры дае настаўніку неабходны псіхалагічны падмурак для стварэння найбольш эфектыўнай метадычнай сістэмы па вывучэнні літаратуры. Як школьны прадмет літаратура фарміруе каштоўнасныя арыентацыі вучняў. Як від мастацтва яна ўключае ў сябе, сінтэзуе амаль увесь спектр каштоўнасцей: ад мастацкіх, эстэтычных да ідэалагічных, прававых і інш.

Пры дапамозе каштоўнасцей і каштоўнасных арыентацый складваюцца і адначасова ў іх жа праяўляюцца адносіны чалавека да свету, адбываецца самасцвярджэнне, самараскрыццё чалавека як грамадскай асобы. Каштоўнасці адыгрываюць важную ролю ў станаўленні асобы і выконваюць пры гэтым *дзве асноўныя функцыі*:

§ з'яўляючыся асновай фарміравання і захавання каштоўнаснай арыентацыі ў свядомасці чалавека, яны дазваляюць заняць пэўную пазіцыю, знайсці пункт погляду, даць ацэнку; каштоўнасці — гэта частка свядомасці, без якой няма асобы;

§ яны матывуюць дзейнасць і паводзіны, паколькі арыентацыя ў свеце і імкненне да дасягнення асобных мэт суадносяцца з каштоўнасцямі, уключанымі ў структуру асобы.

Традыцыйна аксіялогія (ад гр. aksios = 'каштоўны' + -*логія*) – тэорыя каштоўнасцей – з’яўлялася прэрагатывай філасофіі, трактавалася як філасофскае вучэнне аб прыродзе каштоўнасцей. У сучасных умовах аксіялогія набывае ўсё большую самакаштоўнасць і самастойнасць, адбываецца збліжэнне аксіялогіі з педагогікай.

Такім чынам, вышэйзгаданы намі падручнік з’яўляецца адной з першых спроб стварэння вучэбнага дапаможніка па роднай літаратуры, у аснову якога пакладзены прынцып арыентацыі на агульначалавечыя гуманістычныя каштоўнасці, на выяўленне спецыфікі беларускай гісторыі, беларускага жыцця, беларускага нацыянальнага характару. Адметнасцю новага дапаможніка з’яўляецца і тое, што яго аўтары імкнуцца данесці да школьнікаў сутнасць мастацкіх твораў як з’явы эстэтычнай, створанай паводле спецыфічных мастацкіх законаў. Аўтары дапаможніка імкнуцца да таго, каб правесці вучняў па гераічных шляхах нашага народа, па незабыўных старонках нашай літаратуры ад дапісьмовых часоў да перыяду нацыянальнага адраджэння пачатку XX стагоддзя на новым канцэптуальным ўзроўні, а менавіта – аксіялагічным, што дазваляе забяспечыць устойлівыя гуманістычныя ўстаноўкі педагогаў, рашаць праблемы індывідуальна-асобасных каштоўнасцей школьнікаў, зрабіць зместам светапогляду і паняційнага апарату дзевяцікласнікаў асобныя паняцці, катэгорыі тэорыі каштоўнасцей. Невыпадковым з’яўляецца і выбар узросту школьнікаў. Гэты выбар абумоўлены сацыяльна-псіхалагічнымі асаблівасцямі ўзросту старэйшых падлеткаў, як найбольш сензітыўнага для фарміравання вартасных арыентацый, нацыянальнай самасвядомасці. Актуалізацыя духоўных магчымасцей вучняў 9-10-х класаў звязана з фарміраваннем у іх маральных ідэалаў, каштоўнасных арыентацый, светапогляду. Паводле сцвярджэння многіх вучоных, менавіта ў гэтым узросце пераважае аксіялагічнае напружанне жыццёвай прасторы асобы.

У практычнай дзейнасці настаўнікі-філолагі сустракаюцца з цэлым шэрагам цяжкасцей і нявырашаных праблем. Так, напрыклад, працэс літаратурнай адукацыі ў школах рэспублікі, методыка вывучэння літаратуры недаравальна адстаюць ад развіцця літаратуразнаўчай навукі, і настаўнікі, іншы раз, слаба ўсведамляюць значнасць уключэння нацыянальна-гістарычнага кампанента ў змест навучання, не заўсёды ўяўляюць шляхі і прыёмы далучэння вучняў да культурна-гістарычнай спадчыны свайго народа ва ўзаемасувязі з агульначалавечымі каштоўнасцямі. На жаль, у большай частцы педагогаў існуе аматарскі падыход да ўключэння ў навучальны працэс элементаў нацыянальнай культуры, нестае глыбіннай канцэпцыі філасофіі нацыянальнай мовы і літаратуры, сістэмы культуралагічнай свядомасці. Таму, на нашу думку, прапанаваны дапаможнік можа ў поўнай меры садзейнічаць ліквідацыі гэтых прабелаў, павышэнню навукова-тэарэтычнага ўзроўню выкладчыка літаратуры (больш таго,

настаўнікаў-прадметнікаў гуманітарнага цыкла і ўвогуле усіх, хто не абыякавы да роднай літаратуры, культуры свайго народа, здабыткаў усяго чалавецтва).

Кажуць, што сёння час рэцэптурнай педагогікі скончыўся. Таму абсалютна апраўданым, на наш погляд, з'яўляецца адмаўленне аўтарамі дапаможніка ад традыцыйных, звыклых схемаў і трафарэтаў у падачы літаратуразнаўчага матэрыялу і методыцы правядзення ўрокаў. Падзяляем думку прафесара А. У. Рагулі аб неабходнасці пераадолець спакусу модных шаблонаў, якія адцягваюць увагу ад сэнсавых значэнняў канкрэтнага тэксту: *"прачытайце ўважліва", "якім настроем прасякнуты", "якія пачуцці выклікаюць", "як малюецца"* і г. д. Можна яшчэ зрабіць спасылку на некаторыя іншыя ўзоры з ужо добра нам вядомых метадычных дапаможнікаў. Так, напрыклад, *"<u>палічы, колькі раздзелаў і колькі вершаваных радкоў займае</u> апісанне кахання Машэкі і Натальккі ў паэме (да першага іх расстання)", "з якой інтанацыяй прачытаеш верш... (даюцца ключы-падказкі: а) б) в)"*. Прыведзеныя ў дапаможніку адказы на такія заданні выконваюць пры гэтым функцыю "эталонаў" для маральна-эстэтычных меркаванняў вучняў, з'яўляюцца своеасаблівай метадычнай падказкай для абагульненняў настаўніка. Распрацаваная ж сістэма заданняў аўтарамі дапаможніка па беларускай літаратуры для 9 класа выгодна адрозніваецца ад папярэдніх метадычных рэкамендацый і, на наш погляд, галоўным чынам зарыентавана на фарміраванне саміх спосабаў пазнавальнай і эстэтычнай дзейнасці, на развіццё лагічнага і вобразнага мыслення падлеткаў, эмацыянальна-каштоўнасных (аксіялагічных) адносін да вывучаемага твора.

У сваіх літаратуразнаўчых нарысах аўтары падручніка-хрэстаматыі па беларускай літаратуры для 9 класа і вучэбна-метадычнага дапаможніка для настаўнікаў (А. У. Рагуля, В. В. Кушнярэвіч) імкнуліся да стварэння базавых тэарэтычных асноў ведаў настаўніка па гісторыі і тэорыі літаратуры, літаратурнай крытыцы, а таксама вызначылі найбольш важныя ўменні, якія спатрэбяцца педагогу для рэалізацыі сваіх ведаў у школьнай практыцы. Нельга не пагадзіцца з аўтарамі дапаможніка, што, зыходзячы з адукацыйных мэтаў і ўзроставых асаблівасцей навучэнцаў, мэтазгодна трактаваць урокі літаратуры ў старшых класах як педагагічнае літаратуразнаўства, а засваенне здабыткаў сучаснай культуралогіі, літаратуразнаўства глыбей раскрывае філасофскі змест мастацкай літаратуры. Як бачым, метадалагічным прынцыпам канцэпцыі, прапанаванай аўтарамі згаданага вышэй вучэбна-метадычнага комплексу, з'яўляецца культуралагічны падыход да зместу літаратурнай адукацыі, узважаны, навуковы падыход да павышэння культуралагічнай свядомасці вучняў і настаўнікаў, што будзе, безумоўна, садзейнічаць асэнсаванню нацыянальнай літаратуры як адметнай, цэласнай эстэтычнай сістэмы сярод іншых літаратур свету і яе сутнасных, тыпалагічных сувязей з еўрапейскімі літаратурамі. Прапанаваная аўтарамі літаратуразнаўчая і педагагічная канцэпцыя абапіраецца на прыём супастаўлення (кампаратывістыкі) як адзін з найважнейшых прыёмаў вывучэння нацыянальнай літаратуры ў сусветным кантэксце. Прыём

супастаўлення становіцца такім жа універсальным прыёмам методыкі, як гутарка і выразнае чытанне, бо ён неабходны для паступовага разумення вучнямі нацыянальнай літаратуры як цэласнай эстэтычнай сістэмы сярод іншых літаратур свету, а таксама для пазнання школьнікамі унікальнасці духоўнай гісторыі і духоўных каштоўнасцей беларускага народа. Аўтары дапаможніка справядліва зазначаюць, што без прыёму супастаўлення нельга абысціся і ў працэсе самапазнання, самаактуалізацыі і глыбокага сацыяльнага перажывання вучнямі сваёй асобы як чалавека, які жыве цяпер на той самай зямлі, што аплакана і апета ў творах міфалогіі, фальклору, літаратуры; чалавека, які з'яўляецца пераемнікам духоўнай спадчыны свайго народа і неабыякава ставіцца да яго быцця.

Сваёй змястоўнай часткай разглядаемы вучэбна-метадычны комплекс па літаратуры арыентуе на ўкараненне ў школьную практыку асноўных ідэй "Канцэпцыі літаратурнай адукацыі". У прыватнасці, у ёй адзначаецца, што пытанне аб агульначалавечых каштоўнасцях літаратуры мае сэнс толькі тады, калі ў цэнтр увагі ставіцца праблема самапазнання народа і ў сувязі з гэтым – самапазнання асобай свайго нацыянальнага менталітэту. Асэнсаванне свайго нацыянальнага ўкладу ў вырашэнне агульначалавечых праблем і стымуляванне культуратворчай дзейнасці, абуджэнне эмацыянальна-вартаснага "мыслення" вучняў, фарміраванне цікавасці да нацыянальных культурных каштоўнасцей – вось галоўныя мэты вывучэння літаратуры ў школе.

Новая іерархія каштоўнасцей, у якой агульначалавечае – на першым месцы і з'яўляецца абсалютным прыярытэтам, – метадалагічная ідэя, закладзеная педагогамі-вучонымі Рэспублікі Беларусь у нацыянальныя законы, канцэпцыі, праграмы, падручнікі ў сферы выхавання і навучання падрастаючага пакалення. Як слушна сцвярджае прафесар В. У. Протчанка, "наспела патрэба ва ўдакладненні, навуковым абгрунтаванні і тлумачэнні паняццяў *духоўнасць, інтэрнацыяналізм, агульначалавечая культура, агульначалавечыя каштоўнасці,* у распрацоўцы канцэпцыі, прыдатнай для фарміравання духоўнасці і маральнасці ва ўсіх членаў грамадства, асабліва ў школьнікаў. Выхоўваць чалавека – гэта значыць садзейнічаць педагагічнымі сродкамі станаўленню яго як асобы і грамадзяніна з будучымі яго ўчынкамі і ідэямі, перакананнямі светапогляднага, рэлігійнага, маральна-этычнага і эстэтычнага характару" [4, с. 14].

## ***Літаратура***


1. Беларуская літаратура: падручн.-хрэстаматыя для 9 класа / аўт.-склад. А. У. Рагуля, В. В. Кушнярэвіч. – Мн., 2006.
2. Родная літаратура ў 9 класе: вучэб.-метад. дап. для настаўнікаў / А. У. Рагуля, В. В. Кушнярэвіч. – Мн., 2006.
3. *Гудечек, Я.* Ценностная ориентация личности / Я. Гудечек // Психология личности в социалистическом обществе: активность и развитие личности. – М., 1989. – С. 102–109.
4. *Протчанка, В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. – Мн., 2001.